# СЕЗОН ГРЫПУ ЧАКАЕЦЦА Ў СТУДЗЕНІ — САКАВІКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёлета перад пачаткам сезону ўздыму рэспіраторных захворванняў у нашай краіне таксама плануецца правядзенне кампаніі вакцынацыі супраць грыпу. Трыдыцыйна яна будзе праходзіць з пачатку кастрычніка да канца лістапада. Плануецца прышчапіць каля 40 % насельніцтва і не менш за 75 % асоб з груп высокай рызыкі.



Да груп высокай рызыкі развіцця цяжкай формы грыпу і неспрыяльных наступстваў адносяцца дзеці ва ўзросце ад 6 месяцаў да трох гадоў, асобы з хранічнымі хваробамі незалежна ад узросту і імунасупрэсіяй, пажылыя людзі ад 65 гадоў і старэйшыя, цяжарныя жанчыны. Да асоб з высокай рызыкай заражэння ў першую чаргу адносяцца медыцынскія работнікі, а таксама работнікі, чыя дзейнасць звязаная з кантактаваннем з людзьмі, і асобы, якія забяспечваюць бяспеку дзяржавы і жыццядзейнасць насельніцтва. Акрамя таго, вакцынацыя супраць грыпу і каранавіруснай інфекцыі важная для работнікаў сферы адукацыі, гандлю, грамадскага харчавання, камунальнай сферы.

### Ці актуальны яшчэ COVID-19?

Паводле даных з адкрытых крыніц, на сёння ў свеце больш за 21 мільён чалавек знаходзіцца на лячэнні ад COVID-19, што сведчыць пра тое, што небяспека дадзенай інфекцыі не сышла. Кірыл Ігнатаў падкрэсліў, што сёлета вакцынацыя супраць грыпу будзе праводзіцца на фоне кампаніі вакцынацыі супраць COVID-19. Дапускаецца сумеснае ўвядзенне ў адзін дзень вакцыны супраць грыпу і COVID-19, акрамя жывых вакцын. Таксама гэтыя прышчэпкі могуць праводзіцца ў адзін дзень разам з іншымі прышчэпкамі з нацыянальнага календара ці пераліку прафілактычных прышчэпак па эпідэміялагічных паказаннях.

— Калі правядзенне прышчэпак супраць грыпу і COVID-19 у адзін дзень немагчымае, то варта зрабіць мінімальны інтэрвал у два тыдні паміж увядзеннем дзвюх вакцын, — дадаў эпідэміёлаг. — Ва ўмовах адначасовай цыркуляцыі грыпу і COVID-19 існуе верагоднасць адначасовага заражэння, што можа ўскладніць цяжар працякання хваробы.

### Чым будуць прышчапляць?

Па рэкамендацыях Сусветнай арганізацыі аховы здароўя для Паўночнага паўшар'я на гэты эпідсезон рэкамендаваныя вакцыны супраць трох штамаў віруса: H1N1, падобнага на штам «Вікторыя»; H3N2, падобнага на штам «Дарвін»; віруса грыпу B, падобнага на штам «Аўстрыя». Для чатырохвалентных вакцын уключаны штам віруса B «Пхукет».

У нашай краіне ў гэты эпідсезон вакцынацыя супраць грыпу будзе праводзіцца расійскай трохвалентнай вакцынай «Флю-М», французскай «Ваксігрып-Тэтра», швейцарскай «Інфлювак-Тэтра».

Актуальнымі застаюцца і вядомыя меры прафілактыкі — захаванне сацыяльнага дыстанцыянавання, мінімізацыя наведвання месцаў масавага збору людзей, рэспіраторны этыкет, гігіена рук.

У выпадку ўзнікнення рэспіраторных інфекцый, асабліва калі гэта датычыцца дзяцей, не трэба займацца самалячэннем, лепш звяртацца ў медыцынскія ўстановы, нагадаў медык. Санітарныя службы праводзяць дазорнае і руціннае назіранні за рэспіраторнымі інфекцыямі ў 18 кантрольных гарадах, падчас якога аналізуецца колькасць асоб, якія звярнуліся ў медыцынскія ўстановы для атрымання дапамогі. Пакуль пад'ём захваральнасці на рэспіраторныя інфекцыі нязначны і звязаны з тым, што вялікая колькасць дзяцей і падлеткаў пайшла ў навучальныя ўстановы, а таксама паколькі змяняецца надвор'е і колькасць сонечных дзён.

### Якія сімптомы ВРІ?

Для ўсіх рэспіраторных інфекцый у першую чаргу характэрны пад'ём тэмпературы, наяўнасць насмарку, кашлю, болю ў горле. Пры грыпе назіраецца яшчэ і ламота ў целе, суставах, мышцах. Для ўсіх рэспіраторных хвароб актуальныя агульная млявасць і хуткая стамляльнасць. Пры з'яўленні гэтых сімптомаў варта звяртацца па медыцынскую дапамогу.

Усе рэспіраторныя інфекцыі перадаюцца паветранакропельным шляхам — пры чханні, кашлі, дыханні хворы распаўсюджвае рэспіраторныя патагены. Што датычыць грыпу і COVID-19, людзям з аслабленым імунітэтам дастаткова пабыць з захварэлым некалькіх хвілін на адлегласці менш ад метра, каб заразіцца. Для іх надзейнай аховай стане вакцынацыя. Яна не засцерагае ад заражэння, але гарантуе, што працяканне хваробы не будзе цяжкім і не выкліча неспрыяльных наступстваў.

Пры захворванні не рэкамендуецца збіваць гарачкапаніжальным тэмпературу да 38 градусаў. Асабістая гігіена — адна з абавязковых умоў пры лячэнні. Як і правільнае збалансаванае харчаванне, якое дапамагае ўмацоўваць імунітэт.

**Алена КРАВЕЦ.**

Суайчыннікі

# НЕ СТРАЦІЦЬ БЕЛАРУСКАСЦІ Ў САБЕ

## З 19 да 24 верасня праходзіць IV Фестываль мастацтваў беларусаў свету

**Арганізатарамі культурнага форуму выступаюць Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур пры садзейнічанні Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, аблвыканкамаў, Мінгарвыканкама і іншых арганізацый. Абмен вопытам, дэманстрацыя таго, як нясуць родную культуру за межамі нашай краіны, і шмат разнастайных мерапрыемстваў чакае гасцей і наведвальнікаў у найбліжэйшыя некалькі дзён.**

— Фестываль мастацтваў беларусаў свету праводзіцца раз на тры гады. На жаль, пандэмія ўнесла свае карэктывы, таму перапынак быў даўжэйшы. Мэтай дадзенага культурнага форуму з'яўляецца прэзентацыя дасягненняў нашай краіны і падтрымка творчых праектаў беларусаў за мяжой, — адзначыў **намеснік начальніка ўпраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Дзмітрый СЛЯСАРЧЫК.** — Праграма фестывалю сёлета будзе вельмі насычанай. У ёй прадугледжана правядзенне майстар-класаў для нашых замежных гасцей, якія прыехалі да нас (іх будзе каля 250 чалавек), адбудзецца таксама наведванне рэгіёнаў з канцэртамі нашых суайчыннікаў, каб не толькі ў сталіцы ўбачылі тое мастацтва, з якім прыехалі да нас беларусы з-за мяжы.

У сваю чаргу, **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Вольга ЯКАБСОН,** распавядаючы аб праграме для ўдзельнікаў форуму, адзначыла, што мерапрыемствы арганізатары выбіралі, арыентуючыся на ўзрост і пажаданні гасцей:

— Праграмныя мерапрыемствы ў нас распачынаюцца 20 верасня. Чакаем гасцей з Самары, Тальяці і шэрагу іншых гарадоў. Спадзяёмся, што ўдзельнікам фестывалю наша праграма спадабаецца. Але самае галоўнае, што беларусы замежжа прыязджаюць да нас з цудоўным настроем, яны імкнуцца на сустрэчу са сваёй Бацькаўшчынай. І таму ўсё, што мы ім прапаноўваем (сустрэчы, майстар-класы, канцэрты), прымаюць з радасцю, каб насыціцца беларускасцю, а потым, з'ехаўшы ў месцы свайго пражывання, забраць з сабой кавалачак нашай Беларусі да наступнай сустрэчы.

Сёлета плануецца ўдзел у фестывалі прадстаўнікоў беларускіх дыяспар з Расійскай Федэрацыі, Італіі, Казахстана, Эстоніі, ЗША, Арменіі і іншых краін. Вечарам 21 верасня адбудзецца адкрыццё фестывалю і гала-канцэрт у Мінскім гарадскім Палацы культуры. Па словах арганізатараў, асноўная ідэя канцэрта — рушнікі «Шляхі дадому». Удзел у святочнай праграме возьмуць не толькі госці, але і беларускія артысты.

— Мы сёння распавядаем, як Беларусь сустракае сваіх сыноў і дачок, якія пражываюць за межамі краіны, але адчуваюць і не губляюць сувязі з ёю. Гэтых людзі, я сказаў бы, народныя дыпламаты, бо праз іх мы можам даносіць да краін, дзе яны пражываюць, аб'ектыўную інфармацыю пра тое, як і чым жыве наша Беларусь, — сказаў **Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК.** — Безумоўна, нам вельмі важна падтрымліваць сваіх людзей, якія з розных прычын апынуліся за межамі нашай краіны. Гэтаму напрамку аддаецца шмат увагі. Прычым не толькі ў рамках такіх мерапрыемстваў, як фестываль, бо ўзаемадзеянне пастаяннае. Мы аказваем падтрымку нашым дыяспарам. Для іх набываюцца нацыянальныя касцюмы па заяўках суполак, перадаецца літаратура на беларускай мове, наша нацыянальная сімволіка. Так, за 2022 і 2023 гады ўжо аказана такая падтрымка на больш за 90 тысяч рублёў. Атрымалі падтрымку як прадстаўнікі нашых дыяспар у Расійскай Федэрацыі, так і ў Латвіі, Літве, Эстоніі, Іарданіі, Сірыі, Арменіі і іншых краінах. А ў гэтыя дні нам прыемна сустракаць нашых сяброў на іх радзіме.

**Алена ДРАПКО.**

Па сутнасці

# Шлях на гільяцыну



**Для Польшчы надышоў час аплаты амерыканскіх крэдытаў. Час расплаты. Плаціць па рахунках вымушаныя звычайныя палякі. Нават за месяц да выбараў улады людзей не чуюць. Ігнаруюць грамадскае меркаванне. Бо цяперашнія кіраўнікі разумеюць: іх выбірае не насельніцтва Польшчы, іх выбірае істэблішмент з уладных кабінетаў англасаксонскага свету. Людзі гэта адчуваюць. Замест звычайнага праменаду польскіх сем'яў да касцёла на вуліцах Варшавы — маршы раззлаваных палякаў. Польскія ўлады штурхаюць народ на гільяцыну гісторыі. Там утульна або мясцовым нацыяналістам, або збеглым здраднікам. Пішчыць польскі народ пад прыгнётам партыі ПіС.**

Напышлівыя амбіцыі польскіх эліт ужо неаднаразова заводзілі іх у тупік. Суседзі ўрокі гісторыі не вывучылі. Дакладней, палітычныя эліты. З такімі ўладамі стаўкі па крэдытах ад амерыканскага патрона толькі растуць. Жорстка, але праўда. Як і раней, палякаў спрабуюць згуртаваць вакол нянавісці да рускіх. Філасофію калектыўнага Гітлера ўзялі для электаральнай стратэгіі дуды і маравецкія. Жадаючы зноў і зноў распасцерці крылы «ад можа да можа», варшаўскі арол неаднойчы трапляў пад раздачу ад сваіх жа старэйшых таварышаў. Палякі, памятайце: гэта ваш герой Пілсудскі быў сябрам Гітлера. Фюрар нават аплакваў яго смерць. А потым пачаў знішчаць палякаў сотнямі тысяч. Палякі, памятайце: гэта вашы галоўныя саюзнічкі Францыя і Брытанія ўжо на дзясяты дзень вайны пагадзіліся з паражэннем Польшчы.

Амбіцыі ўладаў выходзілі безабаронным палякам праз коміны Майданека. І калі б не подзвіг савецкага салдата, то бязмежжа нацысцкіх эксперыментаў сцерла б Польшчу з твару зямлі. Гэта быў Грунвальд 2.0: нашыя ваяры зноў выратавалі палякаў ад анямечвання. Уздоўж польскіх рэк і на польскіх плацдармах мы паклалі сваіх сыноў. Як мінімум паўмільёна салдат. Затое ўжо ў 2017 годзе польскія ўлады таксама «аддзякавалі». У Польшчы набылі моц папраўкі ў закон аб забароне прапаганды камунізму ці іншага таталітарнага ладу. Дакумент абавязвае мясцовыя ўлады зносіць помнікі савецкім воінам. Па падліках Інстытута нацыянальнай памяці Польшчы, 230 помнікаў салдатам Чырвонай Арміі трэба адправіць пад бульдозер. Што вельмі эфектыўна сцірае з памяці ўдзячнасць. Цяпер ужо ўнукі выратаваных нашымі салдатамі палякаў трымаюць рулі аўтаматаў у напрамку ўсходу.

Раней Польшчу называлі 51-м штатам ЗША. Мы ж памятаем, як яе называў Ленін. Вашынгтон сапраўды купіў Варшаву. Выгадны геапалітычны набытак. Балячка для Старой Еўропы. І халодная помста для Германіі. Польшча на шляху транзіту даступных вуглевадародаў з Сургута да паспяховых прамыслоўцаў Мюнхена. Хвост віхляе сабакам. Хвост віхляе ў патрэбным напрамку гаспадароў з Белага дома. Фігура для гамбіту на вялікай шахматнай дошцы. Прычым адразу па двух напрамках. У заходнім зразумела. Нас гэта датычыцца пасрэдна. Але Польшча ператварылася ў таран і на ўсход. Англасаксы зайшлі з казырнай карты. Нацыяналізму. Зноў ажылі амбіцыі «ожала бялага». Новы праект Рэчы Паспалітай. Перазагрузка.

Зрэшты, пад сукно праект балта-чарнаморскай уніі ніхто не хаваў. Проста ў 1990-я ў жаданы новы палітычны ландшафт не ўпісалася Беларусь. А сваю даўнюю нерэалізаваную мару рэваншу — мяжы да Мінска — польскае кіраўніцтва не хавала. Ілжэдзмітрыі дабіраліся аж да крамлёўскіх сцен. Не здзіўлюся, калі і тады ў рыштунку захопніцкай экспедыцыі ўдзельнічалі заходнія бенефіцыяры. Не здзіўлюся, калі два паўстанні XIX стагоддзя данацілі немцы і брытанцы. А сёння зразумела як белы дзень: у Варшаве праамерыканская ўлада. І наўрад ці Польшча — 51-ы штат ЗША. Са сваімі так не робяць. Палякі вымушаныя быць філантропамі. Падаткі звычайных фермераў (якіх часам штурмуюць украінскія ракеты) і бізнесменаў ідуць на патрэбы краіны-правапераемніцы подзвігаў тых, хто зладзіў Валынскую разню супраць безабаронных польскіх жанчын, дзяцей і старых. Тады загінула дзевяць тысяч палякаў. А іх нашчадкі плацяць спадкаемцам душагубаў. Так, амерыканская дэмакратыя дорага каштуе.

Польшчу ператварылі ў таран, з дапамогай якога хочуць выламаць уваходныя дзверы ў Брэсцкую крэпасць. Звычайныя палякі гэтага не жадаюць. А ў звычайных палякаў ніхто і не пытаецца. І пакуль польскія ўлады лаюцца, ім рыхтуюць новы Майданек — у топку барацьбы дзеля інтарэсаў сусветнага гегемона. Украіна і Польшча — «санітарны кардон» супраць Расіі. Толькі Украіна ўжо ў выкарыстанні, а Польшча яшчэ не. Рэзерв. Рыхтуюць даўно. Самая мілітарызаваная краіна Еўропы. Вучыце гісторыю, суседзі. Згадайце, у што ператвараецца крэсла варшаўскіх кіраўнікоў, калі польскія легіянеры свае крывыя шаблі накіроўваюць на ўсход...

**Яўген ПУСТАВОЙ.**